# З ВОПЫТУ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАНЯТКАЎ ПРЫ ДЫСТАНЦЫЙНАЙ ФОРМЕ НАВУЧАННЯ



**Зіманскі Вадзім Элдаравіч,**
*дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук*

## ДЫСТАНЦЫЙНАЯ ФОРМА – ІНАВАЦЫЙНАЯ ФОРМА СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫІ

*На прыкладзе дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” паказаны працэс падрыхтоўкі дыстанцыйнага курса для выкладання ў ВНУ. Дадзеная дысцыпліна ўключана ў цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін універсітэтаў краіны і мае на мэце ў асноўным практычную падрыхтоўку студэнтаў, у сувязі з чым навучальнымі планамі, як правіла, прадугледжаны практычныя заняткі з адным альбо двума лекцыйнымі.*

Сучаснае грамадства інфармацыйных тэхналогій, так званай постіндустрыяльнай цывілізацыі, у адрозненне ад індустрыяльнага грамадства канца XIX – сярэдзіны XX стагоддзя, у большай ступені зацікаўлена ў тым, каб яго грамадзяне былі здольныя самастойна, актыўна дзейнічаць, прымаць рашэнні, гнутка адаптавацца да зменлівых умоў жыцця.

Адной з інавацыйных формаў сучаснай адукацыі з’яўляецца дыстанцыйная праца з навучэнцамі. Дыстанцыйнае навучанне (ДН) – гэта сістэма навучання, заснаваная на ўзаемадзеянні выкладчыка і навучэнцаў ці навучэнцаў паміж сабой на адлегласці, якая адлюстроўвае ўсе ўласцівыя навучальнаму працэсу кампаненты (мэта, змест, арганізацыйныя формы, сродкі навучання) спецыфічнымі сродкамі ІКТ і інтэрнэт-тэхналогій.

ДН выдатна ўбудоўваецца ў традыцыйную сістэму адукацыі яго складовай часткай, г.зн. навучанне можа быць дыстанцыйным як цалкам, так і часткова. Напрыклад, лекцыі і кантрольныя работы праходзяць у дыстанцыйнай форме, а лабараторныя працы – у вочнай; ці заняткі ў адной частцы выкладчыкаў вочныя, а ў іншых – дыстанцыйныя; ці ўсе заняткі вочныя, а ўсе кансультацыі – дыстанцыйныя і г.д.

**1-ы этап.** Приступаючы да стварэння электроннага дыстанцыйнага курса, варта падрыхтаваць:

1. Матэрыяльна-метадычнае забеспячэнне курса (рэйтынг-план, тэматычны модульны план, спіс рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры, слоўнік (гласарый)).
2. Электронныя варыянты матэрыялаў для тэарэтычнай падрыхтоўкі (лекцыі і інш.).
3. Электронныя варыянты матэрыялаў для практычнай працы (заданні да практычных (семінарскіх) заняткаў, практыкаванні, тэмы рэфератаў і інш.).
4. Электронныя варыянты матэрыялаў прамежкавага і выніковага кантролю (тэсты і інш.).
5. Паколькі кантакт выкладчыка і навучэнца плануецца мінімальны, трэба падрыхтаваць і размясціць на старонцы ў Moodle памятку, у якой прадугледзець магчымыя пытанні па арганізацыі працы па курсе.

Прыклад афармлення раздзела старонкі дыстанцыйнага курса “Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны”, дзе змешчана гэта інфармацыя, прыведзены ніжэй.




Памятка павінна змяшчаць сістэму патрабаванняў па выкарыстанні прапанаванага дыдактычнага матэрыялу, тэрміны выканання заданняў, форму кантакту з выкладчыкам, магчымасць атрымання кансультацый, парадак адпраўлення заданняў для праверкі і парадак дапрацоўкі заданняў у выпадку атрымання нездавальняючай адзнакі. Тут жа, паралельна з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў рэйтынг-плане, можна размясціць інфармацыю аб бонусных і штрафных балах за якасць і своечасовасць выканання працы.

Прыкладны ўзор памяткі:




**2-і этап.** Падрыхтаваўшы вышэйпералічаныя матэрыялы, пяройдзем да другога этапу падрыхтоўкі курса, прыступаючы да якога варта вызначыць:

1. Які рэзерв часу мае выкладчык (на які тэрмін разлічаны курс: адзін семестр, два семестры і інш.; калі плануецца першая сустрэча са студэнтамі і калі будзе праведзены залік).

2. На колькі модуляў падзелены курс; як дадзеныя модулі суаднесці з вылучаным для вывучэння дысцыпліны часам (п. 1).

3. Якая вучэбная нагрузка выдзелена выкладчыку на выкладанне курса; як дадзеную нагрузку суаднесці з часам вывучэння курса і з модульным планам курса; які аб'ём матэрыялу вылучыць на заняткі online, offline і які – для самастойнага вывучэння.

4. Якія спосабы праверкі ведаў, уменняў і навыкаў прадугледзець пасля праходжання кожнага модуля (альбо пасля кожных заняткаў).

5. Што і ў якой форме будзе правярацца на выніковым кантролі.

6. У якой форме будзе праведзены залік; патрабаванні да заліку.

Інфармацыю пунктаў 3 (часткова), 4, 5, 6 неабходна адлюстраваць таксама ў рэйтынг-плане і ў памятцы (гл. 1-ы этап). Прыклад:

Дыстанцыйны курс дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” паводле вучэбнага плана разлічаны на 6 месяцаў працы (верасень-студзень), дзе верасень – установачная сесія, студзень – экзаменацыйная сесія. Залік плануецца правесці ў трэцяй дэкадзе студзеня.

Курс уключае 3 навучальныя модулі і залік. Вучэбная нагрузка выкладчыка – 2 г. аўдыторных заняткаў, 3 г. заняткаў online, 1 г. заняткаў offline, 3 г. – кантрольныя працы, выніковы кантроль – залік.

Размяркуем працу з курсам наступным чынам:

| 2 г. аўдыторныя заняткі | Верасень | |
|---|---|---|
| **1 г.** online. Модуль 1 | Прамежкавы кантроль. К.р. 1 **(1 г.)** | Кастрычнік |
| **1 г.** online. Модуль 2 | Прамежкавы кантроль. К.р. 2 **(1 г.)** | Лістапад |
| **1 г.** online. Модуль 3 | Прамежкавы кантроль. К.р. 3 **(1 г.)** | Снежань |
| **1 г.** offline | Выніковы кантроль | Студзень |
| **Залік** | Студзень | |

2 г. аўдыторных заняткаў (установачная сесія)

| | | |
|---|---|---|
| 1. Верасень | **Аўдыторныя, 2 г.** | Установачная сесія |

1 г. online (Модуль № 1) + 1 г. к.р.

| 2. Кастрычнік | **Online № 1 1 г.** | | | Прамежкавы кантроль, **1 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|
| Від дзейнасці | Самападрыхтоўка. Самастойная праца | Выкананне заданняў | Праверка. Дапрацоўка | Кантрольная праца (тэст) | Праца над памылкамі |
| **Перыяд (дата)** | **01–10** | **11–15** | **16–19** | **20** | **21–31** |

1 г. online (Модуль № 2) + 1 г. к.р.

| 3. Лістапад | **Online № 2 1 г.** | | | Прамежкавы кантроль, **1 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|
| Від дзейнасці | Самападрыхтоўка. Самастойная праца | Выкананне заданняў | Праверка. Дапрацоўка | Кантрольная праца (тэст) | Праца над памылкамі |
| **Перыяд (дата)** | **01–10** | **11–15** | **16–19** | **20** | **21–30** |

1 г. online (Модуль № 3) + 1 г. к.р.

| 4. Снежань | **Online № 3 1 г.** | | | Прамежкавы кантроль, **1 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|
| Від дзейнасці | Самападрыхтоўка. Самастойная праца | Выкананне заданняў | Праверка. Дапрацоўка | Кантрольная праца (тэст) | Праца над памылкамі |
| **Перыяд (дата)** | **01–10** | **11–15** | **16–19** | **20** | **21–31** |

У ходзе правядзення аўдыторных заняткаў (у верасні) выкладчык мае магчымасць пазнаёміць студэнтаў з патрабаваннямі па дысцыпліне, тэрмінамі выканання заданняў, рэкамендуе літаратуру, выкладае асноўныя тэарэтычныя палажэнні курса.

Далей студэнты і выкладчык працуюць дыстанцыйна. У кожным з трох “працоўных” месяцаў (кастрычнік, лістапад, снежань) варта вылучыць перыяды:

а) калі студэнты рыхтуюцца самастойна,

б) калі працуюць у рэжыме online,

в) калі праводзіцца прамежкавы кантроль,

г) калі студэнты маюць магчымасць папрацаваць над памылкамі.

У прывязцы да нагрузкі і да модуляў гэтыя перыяды можна прадставіць у выглядзе вышэйпрыведзенай табліцы.

Старонка модуля ў сістэме Moodle, дзе змешчаны матэрыялы для самастойнай працы, заданні па яе праверцы і прамежкавы кантроль, можа выглядаць наступным чынам (напрыклад, модуль 3).



Матэрыялы для самастойнай працы і самападрыхтоўкі выкладчык падбірае загадзя і афармляе ў выглядзе элемента курса “Старонка”, або “Лекцыя”, або “Заданне” і інш. Гэтыя матэрыялы павінны ўключаць:

пералік ключавых паняццяў і тэрмінаў, практычных уменняў і навыкаў;

тэарэтычныя звесткі;

практычную частку ў выглядзе пытанняў для абмеркавання тэарэтычнага матэрыялу, заданні на замацаванне ведаў, уменняў і навыкаў;

спіс літаратуры, бонусныя заданні (напрыклад, тэмы рэфератаў).

**Тэма ПЗ-1**

Практычныя заняткі № 1

**Тэма: Уводзіны. Беларуская мова – форма нацыянальнаяй культуры беларусаў**

**Ключавыя паняцці і тэрміны:** *білінгвізм, дзяржаўны статус мовы, нацыянальна-моўная палітыка, мова, славянская група моў, соцыум, паходжанне мовы, родная мова, функцыі мовы, этнакультурны змест мовы.*

**Практычныя ўменні і навыкі:**

1) сфарміраваць у студэнтаў устаноўку на практычнае ўкараненне ведаў, атрыманых у працэсе вывучэння дысцыпліны, у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сацыяльных сферах;

2) выпрацаваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай як адной з дзяржаўных моў падчас прафесійных зносін;

3) сфарміраваць у студэнтаў разуменне беларускай мовы як этнакультурнай з'явы і асноўнага кампанента нацыянальнай культуры беларусаў;

**Прынцыпы сучаснай беларускай арфаграфіі**

**Прынцыпы арфаграфіі** – паўная заканамернасць, цесна звязаная з нацыянальнай спецыфікай мовы, на аснове якой будуюцца і аб'ядноўваюцца ў групы канкрэтныя правілы напісання.

| **Фанетычны прынцып** | **Марфалагічны прынцып** | **Традыцыйныя напісанні** | **Дыферэнцыраваныя напісанні** |
|---|---|---|---|
| Напісанне таго ці іншага слова поўнасцю адпавядае яго вымаўленню:<br>– аканне (*сэ́рца-сардэ́ч ны, во́ды – вада́*);<br>– яканне (*сне́г-сняжо́к, ве́чар – вячо́ркі*);<br>– правапіс прыстаўных галосных і зычных (*імгла, аржаны,* | Значымыя часткі слова (марфемы) заўсёды пішуцца аднолькоава, неза-лежна ад іх вымаў-лення:<br>– правапіс звонкіх–глухіх<br>[ш] [т] [с]<br>(*лыжка, адказ,*<br>[з]<br>*просьба*);<br>– правапіс цвёрдых – мяккіх зычных<br>[з'] [ц'] [з] | Напісанні, якія перадаюцца на аснове этымалогіі і традыцыі:<br>– правапіс літары **е** ў першым пераднаціскным складзе:<br>а) у словах неславянскага паходжання (*веранда, сезон, кераміка* і інш.);<br>– напісанне з вялікай літары новага вершаванага радка і інш. | Дазваляюць адрозніваць сугучныя словы або іх формы, якія супадаюць:<br>– напісанне вялікай і малой літары ў словах - амонімах – агульных і ўласных назоўніках (*танк – Танк, колас – Колас*);<br>– напісанне галосных у канчатках аманімічных прозвішчаў і геаграфічных назваў у творным склоне (*з Іваноўым – пад Іванавам*) і інш. |

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Прадмет і задачы курса "Беларуская мова (прафесійная лексіка)", яго сувязь з іншымі дысцыплінамі.

2. Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Беларуская мова як форма нацыянальнай культуры беларускага народа.

3. З гісторыі паходжання і развіцця беларускай мовы.

4. Развіццё і функцыянаванне бел рускай літаратурнай мовы ў XX– пачатку XXI ст. Закон "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь " (1998г.). Этнакультурны статус і камунікатыўная прастора сучаснай беларускай мовы.

**Заданні:**

-

1. Прачытайце выказванні пра мову. Выкажыце свае адносіны да ўзнятых у выказваннях праблем (практ.1 на с. 6-8 (літ. 5); практ.1 на с. 15-16 і практ. 1, 2 на с. 27 (літ. 4) – гл. спіс літаратуры.

2. Прачытайце выказванні рускіх пісьменнікаў і вучоных пра мову. Перакладзіце адзін з наступных тэкстаў (на выбар) на беларускую мову.

*I. По отношению каждого человека к своему языку можно совершенно точно судить не только о его культурном уровне, но и о его гражданской ценности.*

*Истинная любовь к своей стране немыслима без любви к своему языку. Человек, равнодушный к родному языку, – дикарь . … Его безразличие к языку объясняется полнейшим безразличием к прошлому, настоящему и будущему своего народа.*

**Заданні:**

1. З прапанаваных пар слоў утварыце складаныя прыметнікі, вусна растлумачце правапіс галосных.

*Горныя лыжы, рэдкія зубы, востры верх, чорны плод, чорныя валасы, шэрыя вочы, шырокі ліст, высокая якасць, сто кілаграмаў, чырвоныя шчокі, здольны да жыцця, многа людзей, нездольны да жыцця.*

2. Запішыце, як называецца

а) галіна медыцыны, якая вывучае дзіцячыя хваробы і распрацоўвае метады іх лячэння (*педыятрыя*);

б) маленькі пузырок на канцы кожнай бронхі ў лёгкіх, куды пранікае паветра пры дыханні (*альвеола*);

в) мост цераз цясніну, глыбокі яр, дарогу (*віядук*);

г) добры спецыяліст, знаўца сваёй справы (*прафесіянал*).

3. Перакладзіце на беларускую мову. Растлумчце правапіс *у-ў*.

*Полтора, автограф, балкон, канавка, классно-урочный, алфавит, газета «Нива» участвовала в конкурсе, Тамара Владимировна, пневматический, президиум, по-вчерашнему, болгарский, маневры, во Владивостоке.*

4. Выканайце практ. 34 на с. 41 (літ. 6).

5. Слоўнікавы дыктант

Літаратура

**Асноўная**

1. Азарка, В. У.  Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В. У Азарка, А. С. Васілеўская, М. М. Круталевіч.–2-е выд., выпр., дап.– Мінск, 2005.

2. Зуева, І. М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў факультэта фізічнай культуры і спорту/ І. М Зуева. – Віцебск, 2006.

3. Лапкоўская, А. М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб.  дапам./ А. М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.

4. Ляшчынская В.А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка: Вуч. дапам. для студэнтаў ВНУ. – Мінск, 2003.

5. Практыкум па беларускай мове / Пад агул. рэд. Г.М. Малажай. – Мінск, 1993.

6. Сямешка, Л.І  Курс беларускай мовы: Падручнік / Л.І Сямешка. – Мінск, 1996.

-

**Дадатковая**

1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск, 1994.

2. Каласы роднай мовы/ Уклад. У. В. Анічэнка, К. С. Усовіч.– Мінск, 1990.

3. Крук, Я.   Сімволіка беларускай народнай культуры /Я. Крук. – Мінск, 2001.

**Тэмы рэфератаў**

1. **3. Чаму Белая Русь – Белая?" (пра паходжанне назвы Белая Русь).**

Літаратура

1. Імя тваё – Белая Русь / Уклад. Г. Сагановіч. – Мінск, 1991.

2. Тарасаў, К. Памяць пра легенды/  К. Тарасаў.– Мінск, 1994. – С. 43-58.

3. Юхо, Я. Пра назву Беларусь/ Я. Юхо // Полымя. –1968.–№ 1.– С. 175-182.

[1] Арцямёнак, Г. А. Беларуская мова як этнакультурны феномен у гісторыі і    сучаснасці / Г. А. Арцямёнак // Восточнославянские языки в европейском языковом контексте / под ред. Е. Е. Иванова.– Могилев, 2007.– С.100.

[2] Гл.: Арцямёнак, Г. А. Беларуская мова як этнакультурны феномен у гісторыі і    сучаснасці /  Г. А. Арцямёнак // Восточнославянские языки в европейском языковом контексте / под ред. Е. Е. Иванова.– Могилев, 2007.– С. 97–101.

## ЗАНЯТКІ ONLINE

Запланаваныя ў межах курса заняткі online праводзяцца, як правіла, у асобна прызначаны час з выкарыстаннем відэасувязі. Платформа Moodle дазваляе праводзіць online-заняткі з дапамогай праграмы OpenMeetings. Арганізоўваць online-заняткі як відэаканферэнцыі можна таксама з дапамогай праграмы Skype.

У пачатку адпаведнага модуля ў сістэме Moodle (або іншай) мэтазгодна растлумачыць студэнту ўмовы допуску да гэтых заняткаў, а таксама час іх правядзення.

Заданні для заняткаў можна падрыхтаваць:

а) як элементы курса або;

б) у форме прэзентацый ці в) інтэрактыўных лекцый (відэалекцый) – у залежнасці ад таго, якім чынам будуць арганізаваныя занятк і.

Падчас заняткаў выкладаецца тэарэтычны матэрыял, даюцца практычныя заданні; зваротная сувязь ажыццяўляецца праз чат. Прыклад выкарыстання праграмы OpenMeetings з прымяненнем загадзя падрыхтаванай прэзентацыі, у якой прапануецца тэарэтычны матэрыял з прыкладамі і тлумачэннямі, якія выкладчык дае ў ходзе правядзення відэалекцыі (у названай праграме прадугледжаны чат, у якім навучэнцы могуць задаць пытанні, каб высветліць незразумелыя моманты лекцыі). Падрыхтаваную прэзентацыю для зручнасці выкарыстання лепш захаваць у фармаце PDF.

Пасля тэарэтычных пытанняў у рэжыме online прапануюцца заданні (напрыклад, у выглядзе тэста).

Правільны адказ на пытанне тэставага задання праз пэўны час даецца на наступным слайдзе.

Пры немагчымасці арганізаваць відэасувязь можна правесці гэтыя занятк і іншымі спосабамі: выкласці тэарэтычны матэрыял, аформіўшы яго як інтэрактыўную лекцыю ў сістэме Moodle (выкарыстоўваючы інструмент “Лекцыя”), альбо як відэафайл, альбо даць спасылку на інтэрнэт-рэсурс. Пасля вывучэння тэарэтычнага матэрыялу можна прапанаваць студэнтам практычную працу (выкарыстоўваючы інструменты “Заданне”, “Тэст” або ў форме абмену файламі, у тым ліку і праз электронную пошту).

Прыклад выкарыстання модуля абмену файламі і паведамленнямі ў сістэме Moodle прыведзены ніжэй.




Доска
Доска 1
Full-Fit
84
Вадим Элдарович
Зиманский *
Просты
ўскладнены
сказ
Свойства
x 0
w 720
y 0
h 540
Свойства документа
Аднародныя-Занятki..pdf
Активность и действия
Чат
Отправить
RTL


Доска
Доска 1
Full-Fit
84
Вадим Элдарович
Зиманский *
Знайдзіце памылкі ў
пастаноўцы знакаў прыпынку
1) Ведаць мову, валодаць словам, складна
гаварыць: усе гэтыя выразы мы часта чуем але
не вельмі ўдумваемся ў іх сэнс.
2) Ведаць, валодаць, гаварыць – гэта яшчэ не
значыць адчуваць хараство, мілагучнасць,
музыку, жывую душу мовы.
3) Адмысловы штукар, павучок даўганогі з нітак
срэбных зрабіў незямныя дарогі, ад цямна да
цямна вандруе па іх, і гайдае яго ветру цёплага
ўздых.
Свойства
x 0
w 720
y 0
h 540
Свойства документа
Аднародныя-Занятki..pdf
75
Активность и действия
Чат


Доска
Доска 1
Full-Fit
84
Вадим Эльдарович
Зиманский
Знайдзіце памылкі ў пастаноўцы знакаў прыпынку
1) Ведаць мову, валодаць словам, складна гаварыць: усе гэтыя выразы мы часта чуем але не вельмі ўдумваемся ў іх сэнс.
2) Ведаць, валодаць, гаварыць – гэта яшчэ не значыць адчуваць хараство, мілагучнасць, музыку, жывую душу мовы.
3) Адмысловы штукар, павучок даўганогі з нітак срэбных зрабіў незямныя дарогі, ад цямна да цямна вандруе па іх, і гайдае яго ветру цёплага ўздых.
Активность и действия
Свойства
x 0
w 720
y 0
h 540
Свойства документа
Аднародныя-Занятки..pdf
76
Чат


Заметки
Значки
Общее
...НАЛОГІЯ
+ МОДУЛЬ
2.
КУЛЬТУРА
ПРАФЕСІЙН.
МАЎЛЕННЯ
+
МОДУЛЬ 3.
ФУНКЦЫЯН.
СТЫЛІ
МАЎЛЕННЯ
Мои курсы
Настройки
Управление курсом
Режим редактирования
Редактировать настройки
Пользователи
Фильтры
Отчеты
Оценки
Значки
Резервное копирование
Восстановить
Импорт
Очистка
Банк вопросов
Переключиться к роли...
Настройки профиля для Елена Сальчук
Настройки моего профиля
Оксана Худенькая
Поиск
Среда 11 Ноябрь 2015
06:49: ЗАДАННЕ ДА ЗАНЯТКАЎ ONLINE-2
1. Вучыце складзены вамі тлумачальны слоўнік тэрмінаў па сваёй спецыяльнасці. Гэтыя словы трэба будзе адказваць на заліку.
2. Дашліце выкананае заданне 5 П3-1(7).
3. Дашліце выкананае заданне 7 П3-2(8).
4. Дашліце выкананае заданне 3 П3-3(9).
5. Дашліце выкананае заданне 7 П3-5(11).
6. Дашліце выкананае заданне 4а П3-6(12).
7. Дашліце выкананае заданне 1 П3-7(13).
Понедельник 16 Ноябрь 2015
19:50: Многа памылак. Перарабіце (гл. электронную пошту).
Четверг 19 Ноябрь 2015
03:37: Дапрацуйце заданні, выправіўшы памылкі, выдзеленыя чырвоным (гл. электронную пошту).
Суббота 21 Ноябрь 2015
20:28: Заданні заняткаў анлайн № 2 залічаны. Выконвайце заданне 2.3.
Сообщение
Отправить сообщение

## ПРАМЕЖКАВЫ КАНТРОЛЬ ПАСЛЯ ВЫВУЧЭННЯ МОДУЛЯ

Пасля вывучэння матэрыялу кожнага модуля студэнты праходзяць прамежкавы кантроль, які з'яўляецца своеасаблівым допускам да вывучэння матэрыялу наступнага модуля. Умовы і тэрміны выканання таксама павінны быць загадзя растлумачаны студэнтам на адпаведнай старонцы.

Заданні прамежкавага кантролю могуць быць пададзены ў тэставай форме ці любой іншай (прыклады заданняў прыведзены ніжэй).

Магчымасці Moodle (опцыя "Справаздача па адзнаках") дазваляюць адразу пасля выканання тэставых ці іншых заданняў ацаніць вынікі і падаць іх у выглядзе зводнай табліцы і па працы кожнага студэнта асобна.



## ЗАНЯТКІ OFFLINE

У межах курса пэўная колькасць гадзін можа быць адведзена на заняткі offline, калі студэнт самастойна, без удзелу выкладчыка, працуе з прапанаванай літаратурай, вывучаючы выдзеленыя для такіх заняткаў тэмы, самастойна выконвае заданні па замацаванні матэрыялу і рыхтуе справаздачны матэрыял. Умовы і час выканання такіх заданняў таксама павінны быць даведзены да студэнтаў загадзя.

Напрыклад, у межах разгледжанага курса студэнты рыхтуюцца да кантрольнага вуснага выказвання на прафесійную тэму, самастойна падбіраючы тэкст, і, папрацаваўшы над захаваннем норм літаратурнай мовы, звязаных з культурай маўлення, дасылаюць аўдыяфайлы з запісаным матэрыялам на праверку або, пры немагчымасці ажыццявіць такі запіс і дасла-ць яго, адказваюць падчас асабістай сустрэчы з выкладчыкам.






## ЗАДАННІ ВЫНІКОВАГА КАНТРОЛЮ. ЗАЛІК

Пасля выканання на станоўчыя адзнакі заданняў прамежкавага кантролю па ўсіх модулях заняткаў online і offline студэнты дапускаюцца да заданняў выніковага кантролю і заліку.

Асаблівасці правядзення выніковага кантролю і заліку (умовы допуску, час і месца правядзення, пытанні і заданні, якія трэба падрыхтаваць) павінны быць растлумачаны студэнту загадзя:

Несумненна, варыянты працы з навучэнцамі на адлегласці не абмяжоўваюцца прапанаванымі відамі дзейнасці. Кожны выкладчык можа распрацаваць і выкарыстоўваць свае ўласныя формы правядзення дыстанцыйных заняткаў.

ЛІТАРАТУРА


1. Абдуллаев, С.Г. Оценка эффективности системы дистанционного обучения / С.Г. Абдуллаев // Телекоммуникации и информатизация образования. – 2007. – № 3. – С. 85–92.
2. Андрюшин, В. Не выходя из дома: информационные технологии в современных системах обучения / В. Андрюшин // Бухгалтер и компьютер. – 2005. – № 7. – С. 16–20.
3. Галузо, И.В. Система дистанционного обучения MOODLE в рисунках и схемах / И.В. Галузо. – Витебск, 2013.


